Бібліятэчная справа на Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Этап II. “Бібліятэчная справа на Беларусі: дакументы і матэрыялы. 1-я палова XIX – пачатак XX ст.” (2004–2008 гг.)

Даследаванне зарэгістравана ў БелІСА (№ дзяржрэгістрацыі 2004725 ад 21.04.2004г.)

Аб’ект даследавання – бібліятэчная справа на Беларусі.

Мэта праекта – вызначыць тэндэнцыі і спецыфіку ў арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва Беларусі ў першай палове XIX – пачатку XX ст., адлюстраваныя ў архіўных дакументах.

Крыніцазанаўчай базай даследавання з’яўляліся фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і Нацыянальнага гістарычнага архіва ў г. Гродна, а таксама друкаваныя крыніцы. У рабоце з дакументамі выкарыстоўваліся агульнанавуковыя метады аналізу і сінтэзу. Метадалагічнай асновай адбору дакументаў з’яўляліся прынцыпы гістарызма і аб’ектыўнасці. Пошук і адбор дакументаў здзяйсняўся метадам суцэльнага прагляду.

У ходзе даследавання было вывучана 256 дакументаў з 12 архіўных фондаў. На аснове іх аналізу, навуковай апрацоўкі і сістэматызацыі былі выяўлены тэндэнцыі і спецыфіка ў арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва Беларусі на абраным храналагічным адрэзку. Перавага аддавалася тым дакументам, якія давалі найбольш поўнае і цэласнае ўяўленне аб гістарычных умовах развіцця бібліятэчнай справы ў адпаведнасці з палітычным і грамадскім жыццём краіны.

На працягу даследавання створана сукупнасць прааналізаваных, археаграфічна апрацаваных і сістэматызаваных архіўных дакументаў і навукова-даведачнага апарата да іх, якая адлюстроўвае асноўныя тэндэнцыі і асаблівасці развіцця бібліятэчнай справы Беларусі за перыяд з XIX да пач. XX ст.

Вынікам даследавання з’яўляецца зборнік: Бібліятэчная справа на Беларусі: дакументы і матэрыялы. XIX – пачатак XX ст. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; складальнік В.А. Рынкевіч. – Мінск, 2008. – 168 с.

Дадзены зборнік – сістэматызаванае выданне архіўных дакументаў і матэрыялаў, якія адлюстроўваюць гісторыю развіцця публічных губернскіх, гарадскіх, сельскіх, грамадскіх, народных бібліятэк.

У выданні, праз кантэкст дакументаў, асвятляецца дзяржаўная палітыка ў бібліятэчнай сферы і грамадская ініцыятыва па заснаванні бібліятэк.

Зборнік дакументаў і матэрыялаў разлічаны на даследчыкаў гісторыі нацыянальнай культуры, бібліятэказнаўцаў, бібліятэкараў-практыкаў, выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў, усіх, хто цікавіцца нацыянальнай гісторыяй і культурай.